# УЗНІКНЕННЕ АДВАКАТУРЫ Ў БЕЛАРУСІ І СТАНАЎЛЕННЕ ЯЕ ТЭРМІНАЛАГІЧНАГА ВЫЗНАЧЭННЯ

**А. А. Гур'ева**
*суддзя суда Мінскага раёна, кандыдат юрыдычных навук*
*г. Мінск, Беларусь*

Разглядаюцца пытанні развіцця інстытута адвакатуры на тэрыторыі Беларусі ў дастатутны і статутны перыяды. Даецца характарыстыка асноўных формаў адвакацкай дзейнасці, а таксама праводзіцца аналіз гістарычнага паходжання тэрмінаў “адвакат” і “адвакатура” ў разглядаемы перыяд часу.

Рассматриваются вопросы развития института адвокатуры на территории Беларуси в достатутный и статутный периоды. Дается характеристика основных форм адвокатской деятельности, а также проводится анализ исторического происхождения терминов «адвокат» и «адвокатура» в рассматриваемый период времени.

The issues of the development of the institution of advocacy in Belarus in a decent and statutory period are considered. The characteristics of the main forms of advocacy are described, and an analysis is made of the historical origin of the terms “advocate” and “advocacy” in the considered period of time.

Нягледзячы на тое, што ў сучасным разуменні прафесійны інстытут адвакатуры аформіўся ў Беларусі адносна нядаўна – ў XIX ст., яе асобныя формы, якія праяўляліся ў выглядзе прадстаўніцтва і правазаступніцтва, вядомы яшчэ са старажытных часоў.

Развіццё працэсуальнага права на тэрыторыі Беларусі ў перыяд існавання першых беларускіх княстваў мела падобны з іншымі ўсходнеславянскімі народамі характар, бо існавала агульнасць сацыяльна-эканамічнага і палітыка-прававога развіцця, якая знаходзіла сваё адлюстраванне ў тым, што на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі і агульныя для ўсходніх славян помнікі права.

Першапачаткова ў старажытным судаводстве дзейнічаў прынцып “асабістай яўкі”. Суды не былі прафесійнымі і пастаяннымі органамі, а дзейнічалі па меры неабходнасці. Разгляд суда быў публічнай справай усяго народа, таму асабістая яўка ў суд для абедзвюх бакоў была адным з самых святых грамадзянскіх абавязкаў, што не спрыяла ўзнікненню прафесійнага інстытута судовага прадстаўніцтва.

Панаванне звычаёвага права абумовіла зараджэнне і развіццё такой прымітыўнай формы юрыдычнай дапамогі, як натуральнае прадстаўніцтва, якое было шырока вядома на ўсім еўрапейскім

кантыненце. Яго сутнасць заключалася ў тым, што найбольш блізкія для чалавека асобы (родзічы, сябры, сельская грамада) у працэсе прававой спрэчкі дапамагалі яму парадамі, альбо, калі бок па справе не меў магчымасці з якой-небудзь прычыны самастойна прамаўляць на судзе, то і выступаць ад яго імя. Апошняе датычылася ў першую чаргу непаўналетніх асоб, жанчын, а таксама асоб, якія пакутавалі на розныя захвораванні, не дазваляўшыя ім самастойна адстойваць свае правы, напрыклад, псіхічныя захворванні, немата і г. д. [10, с. 19–20]. Адметная рыса такой судовай замены была ў тым, што адна асоба (прадстаўнік) дзейнічала ў судовым працэсе замест другой асобы (прадстаўляемага) такім чынам, што наступствы яго дзейнасці адлюстроўваліся прадстаўляемай асобе, справу якой вёў прадстаўнік [11, с. 208], а судовае рашэнне вынасілася і прыводзілася ў дзеянне на карысць або супраць той асобы, якую ён замяніў на судзе.

Паколькі ў старажытнай беларускай сям'і найбольшымі прававымі паўнамоцтвамі і аўтарытэтам валодаў мужчына, то і на судзе найчасцей менавіта ён прадстаўляў сваю сям'ю ці яе асобных членаў.

Неабходна адзначыць, што ў якасці прадстаўнікоў выступалі не толькі родзічы, але і апекуны. Прыкладам гэтага служыць справа цівуна Троцкага Мацка з пані Барташавай Табаровіч і з панам Юрыям Ільнічам аб маёнтку і аб двары ў месцы Віленскім – "I пан Юрьин Ивановичъ Ильинича мовилъ: ижъ панъ Барътошъ взялъ его за сына место, и именье свое Збляны ему отписалъ, а казалъ ему опекатися душею своею и панею своею … я близкий за нее отмовляти" [1, с. 835–837].

Натуральнае прадстаўніцтва, якое з'яўлялася найбольш старажытнай формай юрыдычнай дапамогі, і, у некаторым сэнсе, формай адвакацкай дзейнасці, не знікла нават з развіццём пісанага права. Больш за тое, натуральнае прадстаўніцва і выпадкі яго выкарыстання былі пазней замацаваны ў трох статутах 1529, 1566, 1588 гг.

Што датычыцца прафесійнага судовага прадстаўніцтва, то шматлікія даследчыкі разыходзяцца ў вызначэнні перыяду яго з'яўлення ва ўсходніх славян. Так, па меркаванню Д. Н. Барадзіна і У. І. Бажэнавай першыя згадкі аб судовым прадстаўніцтве сустракаюцца ў "Рускай праўдзе". Іншыя даследчыкі, у прыватнасці Я. У. Васькоўскі, лічылі, што такія старажытныя помнікі, як, напрыклад, міжнародныя дагаворы з грэкамі і "Руская праўда", абсалютна маўчаць аб судовым прадстаўніцтве [4, с. 20], а ўпершыню аб ім на Русі згадвалася ў заканадаўчых зборніках XII-XV стст. – у Пскоўскай і Наўгародскай судных граматах [2, с. 123].

Адносна Беларусі існуе меркаванне, што з’яўленне адвакатуры на нашых землях звязана са статутным правам (статуты 1529, 1566, 1588 гг.) [8, с. 90–95]. Аднак некаторыя навукоўцы гавораць аб больш старажытным паходжанні, напрыклад, М. М. Навакоўскі, пісаў аб тым, што адвакатура была вядома ўжо ў XIV ст., аб чым сведчыць змест соймавай Канстытуцыі 1347 г. [14, с. 125].

На наш погляд, на тэрыторыі Беларусі прафесійнае (наёмнае) прадстаўніцтва, якое з’яўляецца першай гістарычнай састаўляючай адвакацкай дзейнасці і крытэрыямі якога былі платнасць паслуг і іх аказанне розным асобам (а не толькі сваім сваякам, як, напрыклад, у натуральным прадстаўніцтве), вядома яшчэ ў дастатутны перыяд і звязана з пачатковым перыядам дзейнасці ВКЛ, дзе функцыі прадстаўнікоў паступова пераходзяць ад натуральных прадстаўнікоў да наёмных – дзякоў, пісараў, служэбнікаў, а таксама шляхціцаў [5].

Пазней гэтай справай (прадстаўніцтвам) пачалі займацца і маладыя гаспадарскія дваране: “Жаловал дворанин господарский Петръ Белый от писара замку Краковского Адама на Дороту Хроберскую” [22, р. 90–91].

Такім чынам, судовая практыка дастатутнага і статутнага перыядаў апісвае пры разглядзе спраў удзел так званых натуральных і наёмных прадстаўнікоў. Пры гэтым апісаны від прадстаўніцтва задавальняў толькі патрэбу суцяжнікаў палегчыць судовую абарону. Разам з гэтым запатрабаваннем з цягам часу ўзнікае і другое, не менш значнае – веданне права і юрыдычных асаблівасцей вядзення справы [11, с. 209].

Для абароны правоў на судзе ўжо было недастаткова быць знаёмымі з фактамі справы, патрэбна было разумець юрыдычнае значэнне гэтых фактаў, умець дакладаць іх перад судом вусна альбо пісьмова, раскрываць юрыдычны бок справы, і, акрамя таго, ведаць розныя формы судовага працэсу, усталяваныя законам. У сувязі з гэтым многім людзям стала патрэбна падтрымка і дапамога асобы, якая б ведала тэхніку судаводства, не аднойчы выступала на судзе, добра ведала законы, правапрымяняльную практыку і навуку права. Менавіта гэту судовую падтрымку, на наш погляд, магчыма назваць “правазаступніцтвам” [5].

Станаўленне правазаступніцтва, якое праходзіла амаль адначасова са станаўленнем прафесійнага прадстаўніцтва, адбывалася ў XIV ст. у сувязі з рэцэпцыяй найбольш развітымі і буйнымі беларускімі гарадамі Магдэбургскага права [9, с. 114]. Сутнасць правазаступніцтва выяўлялася ў разнастайных дзеяннях, адметная рыса якіх заключалася ў тым, што яны не толькі дапамагалі суцяжнаму баку ў яго справе,

падтрымлівалі яго юрыдычна, але часцяком, як сведчаць судовыя дакументы, не замянялі бок у працэсе, не перашкаджалі асабістаму ўдзелу пры дакладзе справы і выкарыстанні давернікам сваіх правоў і абавязкаў. Так, у адным з дакументаў гаварылася: "Ино тые купъцы королевецъкие с прокурат(ор)омъ своимъ на тот рок перед королемъ ся, его м(и)л(о)стью, становили и пил(ь)ност(ь) в том чынили" [22, р. 304].

Патрэбна адзначыць той факт, на які звярталі ўвагу некаторыя навукоўцы, што дзейнасць пракуратараў абмяжоўвалася, як правіла, даручэннем іх даверніка. Аб гэтым сведчаць і некаторыя судовыя справы. Напрыклад, у 1511 г. перад вялікім князем ад імя княгіні Мазавецкай выступаў яе паверраны ("посолъ") Ян Войслаўскі, які падчас разгляду справы адмовіўся ад удзелу ў пасяджэнні суда, паколькі не меў паўнамоцтваў: "и посолъ княгини ее милости въ той речы съ нимъ далей ся не правовалъ, бо не мелъ полеценья отъ княгини ее милости. И его милость господаръ казалъ пану Станиславу положити въ трехъ неделяхъ, а княгиня ее милостьмаеть прислати хто бы мелъ о том с паномъ Станиславомъ мовити" [1, с. 691].

Неабходна сказаць, што пытанню межаў паўнамоцтваў надавалася ўвага не толькі ў выпадку ўдзела ў справе пракуратара, але і ў рамках натуральнага прадстаўніцтва.

Як адзначаў К. Малышаў, правазаступніцтва і прадстаўніцтва ў працэсе маглі існаваць побач адзін да аднаго, але ж мелі свае асаблівыя характары і наступствы [11, с. 209]. Таксама судовая практыка сведчыць, што нават адзін і той жа бок па справе ў адным і тым жа працэсе мог мець прадстаўніка і ўзяць яму на дапамогу заступніка (пракуратара). "а з другое стороны от Ядвиги Станьковое Шестьборовича прокуратор и с(ы)нъ Якуб ее теж стали" [22, р. 202]. Або, напрыклад, апякун, як прадстаўнік малалетняга, які вёў справу сам, мог для вымаўлення судовых прамоў выбраць асаблівага знаўцу законаў.

Аналізуючы гэтыя дзве з'явы, мы прыходзім да высновы, што калі судовае прадстаўніцтва мела сваёй мэтай ухіліць нязручнасць асабістай яўкі бакоў у суд і, па сваёй ідэі, не меркавала спецыяльнай падрыхтоўкі прадстаўніка, то сутнасць правазаступніцтва, якое з'яўляецца, падобна медыцыне, вынікам падзелу працы і спецыялізацыі ведаў, складаецца менавіта ў знаёмстве з матэрыяльным і працэсуальным правам, гэта значыць у юрыдычнай адукацыі [5].

Аднак, у разглядаемы намі перыяд выразнага прафесійнага падзелу паміж наёмнымі прадстаўнікамі (дзякамі, пісарамі, служэбнікамі) і правазаступнікамі (пракуратарамі) не было. Спецыялізацыя па прадстаўніцтве і правазаступніцтве была даволі ўмоўнай, часцей за ўсё гэтыя функцыі ажыццяўляліся як першымі, так і

другімі асобамі. І ўсё ж, асноўным накірункам дзейнасці першай катэгорыі асоб была іх непасрэдная службовая дзейнасць (царкоўная, адміністрацыйная і інш.), і толькі потым прадстаўнічая, як адна з дадатковых функцый да іх асноўнай працы. А для пракуратараў правазаступніцтва з'яўлялася асноўнай працай, іх рамяством [5].

Неабходна падкрэсліць, што на тэрыторыі Беларусі ў дастатутны перыяд адвакатура толькі зараджалася, прычым яна з большага не была арганізацыйна і заканадаўча аформлена.

Тым не менш, ужо ў дастатутны перыяд інстытут адвакатуры станавіўся дастаткова важным. А практыка напрацавала столькі працэсуальных юрыдычных набыткаў, што пры распрацоўцы статутаў ВКЛ яны прымаліся да ўвагі і замацоўваліся на заканадаўчым узроўні. Напрыклад, Статут 1529 г. у сваім адзіным артыкуле, прысвечаным адвакатам, забараніў іншаземцам быць пракуратарамі [17], што сведчыць аб важнай для дзяржавы ролі пракуратараў, а таксама аб тым, што, відаць, да прыняцця Статута 1529 г. сярод пракуратараў сустракаліся іншаземцы, і гэта, магчыма, негатыўна ўплывала на дзяржаўнае судаводства, таму і з'явілася такая забарона [5]. Таксама ў судовай практыцы дастатутнага перыяда паказана, што адвакаты павінны былі быць досыць адукаванымі, а таксама павінны былі ведаць беларускую мову. Гэта і пазней знайшло адлюстраванне ў статутным праве.

Што датычыцца сацыяльнага складу адвакатаў, то ў разглядаемы перыяд імі маглі быць як асобы прывілеяванага саслоўя (перш за ўсё шляхта), так і свабодныя людзі простага саслоўя. З ранніх часоў складанне судовых дакументаў (скаргаў, хадайніцтваў, іскаў і інш.) засяроджвалася ў руках духавенства, у першую чаргу дзякаў, хоць сацыяльны статус апошніх мог адрозніваціца. Пракуратарамі з'яўляліся гарадскія жыхары і шляхта, аднак пазней, у статутны перыяд – толькі шляхта. Заробак адвакаты мелі як ад тых устаноў ці паноў, якім яны стала служылі, так і ад асоб, якія іх наймалі для вядзення канкрэтнай справы аднаразова. Людзі разумелі, што ўдзел у судовай справе пракуратара павялічваў шансы на добры зыход справы, таму не шкадавалі на гэта грошай.

Пры разглядзе пытання станаўлення адвакатуры намі былі адзначаны разнастайныя паняцці абаронцаў, таму, на наш погляд, неабходна прааналізаваць тэрміналагічныя асаблівасці кожнага з іх.

Гістарычнае паходжанне тэрміналогіі "адвакат" і "адвакатура" не мае глыбокіх даследчых традыцый у Беларусі. Нельга ўзгадаць хоць адну працу або даследаванне беларускіх навукоўцаў-юрыстаў у гэтым кірунку, у той час як літоўскія і польскія даследчыкі надалі гэтаму

пытанню нямала ўвагі. Так, толькі за апошняе дзесяцігоддзе можна назваць некалькі даволі грунтоўных даследаванняў у гэтай сферы. Перш за ўсё гэта праца А. Рагускаса "Ka reiske terminas "patricius" XVII a. Vilniuje?" [25] і даследаванне І. Янулайтэса "Vyriausias Lietuvos Tribunolas XVI-XVIII a" [20]. Таксама варта згадаць адзін з раздзелаў кнігі І. Левіна "Palestra w dawnej Polsce" [21] і артыкул К. Ажэхоўскага ""Mecenas" – dzieje pojecia i kilka refleksji o adwokaturze Szlacheckiej Rzeczypospolitej" [23], дзе аўтары спрабавалі даць тлумачэнні ўсім тым паняццям, якія вызначалі адваката і ўжываліся на судовых працэсах, былі замацаваны ў гістарычных прававых актах і запісах Літоўскіх метрык.

З аналізу прыведзеных прац вынікае, што разам з тэрмінам "абаронца" ўжываліся і іншыя тэрміны, якія змяняліся з цягам часу ў сувязі з пераглядам каштоўнасцей і прыярытэтаў. Варта таксама адзначыць, што ўмовы ўжывання розных тэрмінаў, пачынаючы з канца XVI ст., дыктавалі і тэндэнцыі ў Польшчы.

З вывучэння літаратурных крыніц і дакументальнага матэрыялу выцякае, што ў XVI ст. – канцы XVIII ст. у судах у якасці абазначэння адваката ўжываліся наступныя тэрміны: пракуратар, умацаваны, патрон, а таксама пленіпантэнт.

Тэрмін жа "пракуратар" з'яўляецца адным з найстарэйшых тэрмінаў, узнікненне якога было звязана, па-першае, з увядзеннем на тэрыторыі Беларусі Магдэбургскага права [5], і, па-другое, яго замацаваннем у трох статутах [11, с. 207]. Напрыклад, паводле "декрета от 08 июля 1521 г. мещанину виленскому Филипу Воиниловичу з братею его молодшою и з братаничи о дел ровныи во всеи маетности отца их" інтарэсы Грыцка і яго братоў прадстаўляў пракуратар: "Жаловал нам мещанин виленскии Филипъ Воиниловичъ на братью свою молодшую Грицка а Ивахна и на братаничовъ своих… Пришодши перед них на ратушъ Шимон, прокуратор з стороны Грицка и его братьи…" [6]. У архіўных дакументах таксама згадваецца пра удзел у судовых справах пракуратара: "…Prokuraterom Wilenskim y catq kapitutq Wilenska, Jasnie Wielmoznym Jmciq Xiqdzem Leonem Kizka …" [12].

Можна прывесці таксама некалькі судовых спраў, у якіх выкарыстоўваецца тэрмін "умацаваны". Так, па справе "О наъездъ подданныхъ Тарасовской волости на съножать Трухоновскую", разглядаемай у 1582 г. у Мінскім гарадскім судзе ад імя пана Каспара Фёдаравіча Керсноўскага, падсудка земскага землі Наўгародскай, выступаў умацаваны Крыштаф Керсноўскій [15]. У архіўных дакументах Слонімскага земскага суда за чэрвень 1588 года ўзгадваецца: "Сазнанне ўмацаванага старасты чаркаскага князя Аляксандра

Вішнявецкага зямяніна гаспадарскага Лідскага павету Льва Копця пра дамову з зямянінам гаспадарскім Стэжыцкага павета Крыштафам Каранеўскім аб прызначэнні тэрміну і ўмоў разгляду справы аб іспашы ў Дзярэчыне” [16].

Што датычыцца тэрміна “пленіпантэнт” (ад лац. pleni potens - паўнамоцны), то ён пачаў узгадвацца ў судовых дакументах, пачынаючы з другой паловы XVII ст., і абазначаў асобу ў судзе, якая прадстаўляла адзін з бакоў. Так, па справе “между солодовниковъ и цехмистромъ ихъ Григоріемъ Богдевичемъ” ад 16 траўня 1661 года ад імя Грыгорыя Багдзевіча выступаў пленіпантэнт Мікалай Пракаповіч [18, с. 278].

Адначасова з канца XVII ст. ва ўжыванне ўводзіцца тэрмін “патрон” (паўнамоцны прадстаўнік), які становіцца дамінуючым і ў XVIII ст. Так, у актах Літоўскага Трыбуналу запісана “Przed nami … stanąwszy personaliter u sądu patron imć pan Thomasz Gąsowski opowiadal…” [19, с. 122–123].

Выклікаў інтарэс і той факт, што ў XVIII ст. у гістарычных дакументальных актах сталі згадвацца памагатыя абаронцаў – “патроны 2-га класа, якіх звалі агентамі” [24, s. 91]. Упершыню гэты тэрмін сустракаецца ў соймавай канстытуцыі 1673 г. [26, s. 57–95].

У гэты ж перыяд пачало сустракацца слова “mecenas” (павераны). Апошняе вызначэнне ўтварылася ў выніку пераўтварэння бытуючага ў народзе пазначэння чалавека, што валодае пазнаннямі ў сферы юрыспрудэнцыі, і якому давяралі вядзенне сваіх спраў “procurator mercenarius” (платны, прафесійны абаронца) [21, s. 11].

Дзе-нідзе ў юрыдычных дакументах сустракаўся тэрмін “палестрант” [27, s. 208–210]. Пры гэтым з’яўленне ў судовай тэрміналогіі вышэйазначанага слова было звязана з утварэннем Палестры (адвакатуры), аб якой упершыню афіцыйна згадваецца ва ўступе да Канстытуцыі 1726 г. і ў асноўным тэксце Канстытуцыі 1764 г. [28, s. 189]. Неабходна адзначыць, што да ўжывання на заканадаўчым узроўні азначанага вышэй тэрміна, ён у XVI-XVII стст. ужо актыўна выкарыстоўваўся ў грамадстве і абазначаў асоб, якія прафесійна займаліся працэсуальным прадстаўніцтвам [3, с. 257].

У XVIII-XIX стст. падчас знаходжання беларускіх зямель у складзе Расійскай Імперыі, адвакаты ўзгадваліся як “прысяжныя страпчыя”, “павераныя”. Так, у справе “О нарушеніи фундушевной записи, данной ктиторомъ Заблудовской Успенской церкви А.Ходкевичемъ, относительно десятины съ крестьянъ Заблудовскаго грабства” за 1816–1821 гг. указвалася: “… при произведеніи въ Заблудовскомъ графствъ вновь размежеванія земли, принадлежащей княднъ Стефаніи Радзивилъ, присланный отъ опеки ея въ оное имъніе

повъренный Сaковичъ для слъланія вновь описи той землъ…” [7, с. 279–280]. Пасля судовай рэформы 1864 г. у судаводстве ўжываліся тэрміны “прысяжны” і “прыватны паверaны”.

У XIX ст. дзе-нідзе ў гістарычна-прававых архіўных дакументах сустракаецца тэрмін “адвакат”. У архіўных дакументах Мінскага земскага павятовага суда ад 1811 г. упамінаецца справа “по жалобе поверенного князя Доминика Радзивила о недопущении аренды фальварка Михалова Францишком Козакевичем и подаче адвакатом Радзивилов прошения в суд о возвращении фальварка Михалова” [13].

Ужыванне тэрміна “адвакат” у пачатку XIX ст. – гэта, магчыма, адгалосак усходнееўрапейскага ўплыву.

Пасля кастрычніцкіх падзей 1917 г. і утварэння Беларускай савецкай сацыялістычнай рэспублікі ў навуковай літаратуры згадваецца “калегія правазаступцаў”, якая за кароткі час трансфармавалася ў “калегію абаронцаў” і азначаны тэрмін быў замацован на заканадаўчым узроўні ў 1918 г. Пад такой назвай адвакатура праіснавала да 1939 г., калі Саўнаркамам СССР было прынята “Положение об адвокатуре СССР”.

З праведзенага аналізу можна прыйсці да высновы, што з цягам часу ўсе адзначаныя вышэй абазначэнні, увабраўшыя ў сябе тыя або іншыя рысы прадстаўніцтва і правазаступніцтва, трансфармаваліся ў адзінае паняцце. Яно вызначае чалавека, які валодае адмысловымі пазнаннямі ў сферы юрыспрудэнцыі і аказвае свае паслугі на платнай аснове, – гэта “адвакат”. Менавіта дадзенае абазначэнне абаронцы і прафесійнага прадстаўніка інтарэсаў даверніка ў судзе дайшло да нашага часу і шырока выкарыстоўваецца ў дзеючых нарматыўных прававых актах.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Акты Литовской Метрики / собр. Ф.И. Леонтовичем. Варшава : Варш. ун-т, 1896–1897. Т. 1, вып. 1 : 1413–1498 гг. 1896. [4], 169 с.
2. Анохина С.В. Зарождение и развитие института представительства с древних времен до конца XVIII века // Право и политика. 2005. № 9. С. 122–129.
3. Бардах Ю. История государства и права Польши / Ю. Бардах, Б. Леснодорский, М. Пиетрчак. М. : Юрид. лит., 1980. 559 с.
4. Васьковский Е.В. Организация адвокатуры : в 2 ч. СПб. : Н.К. Мартынов, 1893. Ч. 1 : Очерк всеобщей истории адвокатуры. VIII, 396 с.
5. Гур’ева А.А. Формы адвакацкай дзейнасці на тэрыторыі Беларусі ў XVI стагоддзі // Право.by. 2012. № 6. С. 15–18.
6. Декрет мещанину Виленскому Филиппу Войниловичу по делу с его младшими братьями и братаничами о разделе отцовского имущества, 08.07.1521 г. //

LietuvosMetrika. Knyga № 10 (1440–1523) : užrašymų knyga 10 / Lietuvosistorijosinst. ; parengė: D. Antanavičius, A. Baliulis. Vilnius, 1997. С. 84–85.

7. Дело о нарушении фундушевой записи, данной ктитором Заблудовской Успенской церкви А. Ходкевичем, относительно десятины с крестьян Заблудовского грабства, № 562 // Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при Управлении Виленского учебного округа : [в 14 т.]. Вильна, 1890. – Т. 11 : [документы 1545–1823 гг.]. С. 279–280.

8. Довнар Т.И. История государства и права Беларуси : учеб. пособие / Т.И. Довнар, Н.М. Юрашевич. Минск : Акад. упр. при Президенте Респ. Беларусь, 2005. 317 с.

9. Доўнар Ю.П. Судовая рэформа XVI стагоддзя ў Вялікім Княстве Літоўскім. Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2007. 173 с.

10. Калмыкова Н.В. Организация и деятельность адвокатуры : учеб.-метод. Комплекс. Минск : Мин. ин-т упр., 2005. 139 с.

11. Малышев К. Курс гражданского судопроизводства : в 3 т. СПб. : Тип. М. М. Стасюлевича, 1874–1879. Т. 1. 1876. VIII, 444 с.

12. Национальный исторический архив Беларуси (НИАБ). Ф. 1702. Оп. 1. Главный Трибунал ВКЛ (Главный Литовский Трибунал). Д. 9. Л. 119.

13. НИАБ. Ф. 686. Оп. 1. Минский земский поветовый суд (1796–1831 гг.).

14. Новаковский, М.М. Очерк судоустройства и гражданского процесса по бывшим Статуту литовскому и конституциям. СПб. : Гос. канцелярия, 1863. Разд. паг.

15. О наезде подданных Тарасовской волости на сеножать Трухоновскую //Акты, издаваемые Виленской комиссией для разбора древних актов : [в 39 т.]. Вильно, 1912. Т. 36 : Акты Минского гродского суда, 1582–1590 г.г. (Виленского центрального архива № 11765) / [предисл. И.Я. Спрогиса]. С. 342–344.

16. Сазнанне ўмацаванага старасты чаркаскага князя Аляксандра Вішнявецкага зямяніна гаспадарскага Лідскага павету Льва Копця пра дамову з зямянінам гаспадарскім Стэжыцкага павета Крыштафам Каранеўскім аб прызначэнні тэрміну і ўмоў разгляду справы аб іспашы ў Дзярэчыне // НИАБ. Ф. 1785. Воп. 1. Слонімскі земскі суд (за чэрвень 1588 г.).Спр. 7. Арк. 113–114 адв.

17. Статут Великого княжества Литовского 1529 года / под ред. К.И. Яблонскиса. Минск : Акад. наук Белорус. ССР, 1960. 253 с.

18. Судебное определение Виленского магистра по делу между цехом солодовников и цехмистром их Григорием Богдевичем // Акты, издаваемые Виленской Археографической комиссией : [в 39 т.]. Вильна, 1879. – Т. 10 : Акты Виленского магистрата и магдебургии, [1500–1897 гг. / предисл. И. Спрогиса]. С. 277–282.

19. Универсал Полоцкого воеводы Доминика Слушки к Миленским и Девицким боярам о том, чтобы они не сопротивлялись отдать третью часть своей земли Полоцкому иезуитскому коллегиуму // Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией : [в 39 т.]. Вильна, 1886. Т. 13 : Акты Главного литовского трибунала, [1395–1797 гг. / предисл. С. Шолковича]. С. 122–123.

20. Janulaitis A. Vyriausiasis Lietuvos Tribunolas XVI–XVIII amž.: jo atsiradimas, veikimas ir reikšmė Lietuvos gyvenime. Kaunas : [Lietuvos univ.], 1927. 171 p. (Teisių fakulteto darbai ; T. 2, kn. 4).

21. Lewin I. Palestra w dawnej Polsce /I. Lewin. Lwów : Red. Pamiętnika Hist.-Praw., 1936. 124 s.

22. Lietuvos metrika = LithuanianMetrica = Литовская метрика (1528–1547).6-ojiTeismų bylų knyga (kopija – XIVa. pabaiga) / Vilniausuniv. ; red. kol.: S. Lazutka (ats. red.) [etal.]. Vilnius : Vilniausuniv. leidykla, 1995. CXLVIII, 336, [3] p.
23. Orzechowski K. "Mecenas" – dzieje pojęcia i kilka refleksji o adwokaturze Szlacheckiej Rzeczypospolitej // Palestra. 1996. № 3/4. S. 74–78.
24. Rafacz J. Zastępcy stron w dawnym procesie polskim. Kraków : Pol. Akad. Umiejętności, 1923. 91 s.
25. Ragauskas A. Ką reiške terminas "patricius" XVII a. Vilniuje? // Tarp istorijos ir butoves : studijos prof. Edvardo Gudavičiaus 70-mečiui / sudare: A. Bumblauskas, R. Petrauskas. Vilnius, 1999. P. 319–334.
26. Volumina legum: prawa, konstytucie y przywileie Krolestwa Polskiego, Wielkiego Xięstwa Litewskiego y wszystkich prowincyi należących na walnych seymiech koronnych od seymu wiślickiego roku pańskiego 1347 aż do ostatniego seymu uchwalone : przedr. zbioru praw staraniem XX. Pijarow w Warszawie, od r. 1732 do r. 1782 wydanego. – Petersburg : J. Ohryzko, 1860. T. 5 : Ab anno 1669 ad annum 1697. – 463, XV s.
27. Volumina legum: prawa, konstytucie y przywileie Krolestwa Polskiego, Wielkiego Xięstwa Litewskiego y wszystkich prowincyi należących na walnych seymiech koronnych od seymu wiślickiego roku pańskiego 1347 aż do ostatniego seymu uchwalone : przedr. zbioru praw staraniem XX. Pijarow w Warszawie, od r. 1732 do r. 1782 wydanego. – Petersburg : J. Ohryzko, 1860. T. 6 : Ab anno 1697 ad annum 1736. – 208, VII s.
28. Volumina legum: prawa, konstytucie y przywileie Krolestwa Polskiego, Wielkiego Xięstwa Litewskiego y wszystkich prowincyi należących na walnych seymiech koronnych od seymu wiślickiego roku pańskiego 1347 aż do ostatniego seymu uchwalone : przedr. zbioru praw staraniem XX. Pijarow w Warszawie, od r. 1732 do r. 1782 wydanego. – Petersburg : J. Ohryzko, 1860. T. 7 : Ab anno 1764 ad annum 1768 acta reipublicae continens. 403, XI s.